Источник: "Belarus" - №6, 2024-06-21





# ПАМЯЦЬ – СВЯТЫ АБАВЯЗАК

Пасяджэнне Кансультатыўнага міжканфесійнага савета пад старшынствам Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандра Румака, прысвечанае тэме захавання памяці пра Вялікую Айчынную вайну, прайшло ў храме Узвіжання Крыжа Гасподняга. Месца гэта абрана невыпадкова. Тут з 1941 па 1944 гады размяшчаўся лагер ваеннапалонных Шталаг-352. Згодна з дадзенымі Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі, тут было знішчана 80 тысяч чалавек, на гэты час вядомы імёны толькі 14 з паловай тысяч. Вядзецца праца па зборы інфармацыі пра тыя жахлівыя падзеі.

У пасяджэнні савета ўзялі ўдзел кіраўнікі рэлігійных і грамадскіх аб'яднанняў, прадстаўнікі Нацыянальнай акадэміі навук і Міністэрства абароны.

Сёння на тэрыторыі былога Шталага-352 створаны манумент, дзе размешчана інфармацыя пра адзін з буйнейшых лагераў, дзе знішчалі ваеннапалонных. Як расказаў дырэктар Нацыянальнага агенцтва па турызме Дзмітрый Марозаў, гэта месца такое ж важнае для захавання памяці як Хатынь, Трасцянец, Мінскае гета. Кожны лагер смерці дазваляе паказаць, якія трагедыі адбываліся на нашай зямлі. І Шталаг-352 не толькі расказвае пра канткрэтныя злачынствы, здзейсненыя на яго тэрыторыі, гэта яшчэ і вобраз, які дае ўяўленне пра тое, што ў гады вайны адбывалася на такіх аб'ектах. У самым яе пачатку ў палон патрапілі сотні тысяч воінаў Чырвонай Арміі, для іх нямецкім камандаваннем была створана цэлая сістэма лагераў. Толькі на тэрыторыі Беларусі яны размяшчаліся ў 60 населеных пунктах.



Экскурсія па Музеі подзвігу савецкіх ваеннапалонных-вязняў Шталага–352

Шталаг-352, які знаходзіўся каля вёскі Масюкоўшчына (сёння гэта тэрыторыя горада), быў пабудаваны для масавага знішчэння ваеннапалонных, штодня тут праходзілі расстрэлы і катаванні. Кожную раніцу з баракаў, шчыльна запоўненых людзьмі, выносілі каля сотні цел – людзі паміралі ад голаду, холаду, хвароб.

Тэрыторыя лагера смерці музеефікавана. Створана віртуальная гісторыя гэтага аб'екта. На мемарыяле можна пабачыць карту з QR-кодамі, фота пабудоў лагера, атрымаць інфармацыю пра тое, што адбывалася на гэтых аб'ектах. Храм на месцы трагедыі пабудаваны па ініцыятыве Беларускай праваслаўнай царквы, дзеля таго, каб ушанаваць памяць пра ахвяр, памаліцца за іх. Пры храме працуе Музей подзвігу савецкіх ваеннапалонных-вязняў Шталага–352. У ім змешчаны архіўныя здымкі, асабістыя рэчы ахвяр, дошкі і бэлькі баракаў, на якіх ахвяры выдзералі звесткі пра сябе з надзеяй, што пасля пра гэта змогуць даведацца іх блізкія. Невялікі музей паглыбляе ў жахлівую гісторыю, адзін з яго пакояў – імітацыя баракаў, якія былі перагружаныя вязнямі. Так зімой 1941–1942 гадоў у Шталагу-352 было 10 тысяч вязняў, большая частка з іх да вясны не дажыла.

Менавіта з ускладання кветак і экскурсіі па музею пачалося пасяджэнне міжканфесійнага савета. Крыжаўзвіжанскі храм – выдатны прыклад таго, якую ролю ў перадачы памяці могуць адыгрываць рэлігійныя і грамадскія аб'яднанні.



Ганна Трошына. Памяць - святы абавязак

Источник: "Belarus" - №6, 2024-06-21



Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Веніямін падчас пасяджэння заўважыў, што сёння да тэмы вайны важна падыходзіць з пункту гледжання духоўнага асэнсавання. Вялікую Перамогу можна разглядаць як барацьбу дабра са злом. Вельмі важна зрабіць высновы, каб падобныя трагедыі не паўтараліся. У той жа час дзякуючы асэнсаванню падзей Вялікай Айчыннай вайны можна наладжваць работу з моладдзю, прывіваць ёй пэўныя каштоўнасныя арыенціры.

Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр Румак упэнены, што захаванне гістарычнай памяці з'яўляецца святым абавязкам. Нельга забывацца і пра жахлівыя лічбы забітых, і пра тысячы разбураных і спаленых гарадоў і вёсак, і пра гераічнае супраціўленне. Важна, каб надалей гэта памяць перадавалася падрастаючым пакаленням. Сёння ў Беларусі шмат робіцца ў гэтым кірунку; працуюць музеі, пабудаваны мемарыяльныя комплексы, ствараюцца дакументальныя і мастацкія фільмы, дзейнічаюць маладзёжныя патрыятычныя атрады, па дапамогу якіх прадстаўнікі рэлігійных аб'яднанняў могуць звяртацца, каб добраўпарадкаваць святыні і месцы памяці.






Як расказаў першы сакратар Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Аляксандр Лук'янаў у перыяд з 2023 па 2024 гады ў ходзе рэалізацыі праекта "Аднаўленне святынь Беларусі. Нас аб'ядноўвае гісторыя і вера" на тэрыторыі нашай краіны было праведзена 285 мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні сацыяльна значных рэлігійных аб'ектаў розных канфесій, помнікаў Вялікай Айчыннай вайны, месцаў воінскага гераізму і славы. У такіх акцыях былі задзейнічаны каля трох з паловай тысяч валанцёраў. Добраўпадкавана 68 праваслаўных аб'ектаў, 6 каталічных, 43 брацкія магілы, у тым ліку мусульманскія пахаванні. Мітрапаліт Мінска-Магілёўскай архіепархіі Рымска-каталіцкай царквы ў Рэспубліцы Беларусь, архіепіскап Іосіф Станеўскі расказаў пра тое, якую работу для захавання памяці пра Вялікую Айчынную вайну робяць каталіцкія святары. Так, да дня Перамогі і ў дні памінання ахвяр, праходзяць спецыяльныя богаслужэнні. Распрацаваны адукацыйныя праграмы для дзяцей і моладзі, на якіх удзяляецца ўвага выхаванню такіх якасцяў, як смеласць, мужнасць, вернасць Богу і Айчыне, гаворыцца пра важнасць захавання міру ва ўсім свеце. Сіламі прыхаджан даглядаюцца магілы невядомых воінаў і ахвяр вайны.

Вялікая работа прадстаўнікамі рэлігійных аб'яднанняў робіцца для асвятлення тэмы генацыду. Пры саюзе беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і абшчын створана Камісія па ўвекавечанні памяці ахвяр Халакосту. Дзякуючы яе рабоце пастаўлена 160 помнікаў ахвярам – прадстаўнікам яўрэйскага насельніцтва. Шмат робіцца і для ўшанавання праведнікаў свету – жыхароў Беларусі, якія ў гады вайны, рызыкуючы ўласным жыццём, ратавалі яўрэяў.

Як паведаміў старшы афіцэр першага аддзела ўпраўлення інфармацыі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь Сяргей Шохаў, важкі ўнёсак у захаванне гістарычнай памяці беларускага народа і праўды аб Другой сусветнай вайне ўносіць дзейнасць упраўлення па ўвекавечванні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў, 52-і асобны спецыялізаваны пошукавы батальён. У 2023 годзе палявыя пошукавыя работы былі праведзены на 141 пошукавым аб'екце па ўсёй тэрыторыі краіны, у тым ліку і на 41 аб'екце ў рамках расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Знойдзены і падняты для ўрачыстага пахавання астанкі больш чым дзвюх тысяч загінулых, устаноўлены звесткі пра 72 з іх.

Ганна **Трошына**

Фота Алены Дзядзюлі



Ганна Трошына. Памяць - святы абавязак